ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ЧАЦВЕР
4 сакавіка
1993 года
№ 3
(1690)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ДА НАС ПА СПРАВАХ

## АМЕРЫКАНЦЫ, ЯКІХ НЕ ХВАЛЮЮЦЬ ГРОШЫ

***«Маладзёжная місія» — амерыканская арганізацыя рэлігійна-асветніцкага накірунку. Па словах яе членаў, прапаведуюць яны вучэнне Хрыста і тлумачаць людзям місію Бога.***

*Прыхільнікаў гэтай ідэі налічваецца каля 30 тысяч, прычым людзі тут розныя: студэнты і служачыя, рабочыя і прадпрымальнікі. Дарэчы, цэнтр арганізацыі знаходзіцца ў Арканзасе, адкуль прыйшоў у Прэзідэнцтва Біл Клінтан.*

*Ужо чатыры тыдні група «Маладзёжнай місіі» знаходзіцца на Беларусі. За гэты час яны правялі сустрэчы ў бальніцах, дзіцячых дамах, вучылішчах Мінска і Барысава. Іх сустрэчу са студэнтамі нашага універсітэта арганізаваў Цэнтр маладзёжных ініцыятыў.*

*Хлопцы і дзяўчаты з-за акіяна казалі пра вялікую ролю Ісуса Хрыста ў сваім жыцці, зачытвалі любімыя ўрыўкі з Бібліі. Але найбольш спадабаліся прысутным спевы амерыканцаў. Хаця хор і лічыцца непрафесійным, узровень выканання дастаткова высокі.*

*А потым былі шчырыя размовы, больш блізкія знаёмствы паміж амерыканцамі і нашымі студэнтамі. «Нам вельмі цікава было сустрэцца з вашай моладдзю,— гаворыць спадар Джон, кіраўнік дэлегацыі.— Нас усіх аб'ядноўвае гасподзь Бог. За час, які правялі на Беларусі, мы з радасцю пераканаліся, што і вы прымаеце вучэнне Госпада нашага. Гэта дапаможа беларусам выйсці з той складанай сітуацыі, у якой яны пакуль знаходзяцца».*

ПІНГ-ПОНГ

## А ДОМА ЛЕПШ

***«Пад час сесіі я рыхтавалася да экзаменаў у Нацыянальнай бібліятэцы. Залы універсітэцкай больш утульныя, і чэргаў вялікіх тут не бывае. Але ёсць сумненне — магчыма, фонды яе не такія ўжо багатыя».***

**Л. БУРАСАВА,**
**студэнтка.**

**За адказам мы звярнуліся да дырэктара бібліятэкі Ірыны Уладзіміраўны АРЭХОЎСКАЙ.**

— Забяспечанасць вучэбнай літаратурай па некаторых дысцыплінах у нас нават лепшая, чым у былой Ленінцы. Так што падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў хопіць і лірыкам, і фізікам. Я ведаю супрацоўнікаў універсітэта, якія і ў падрыхтоўцы кандыдацкіх работ карысталіся ў асноўным фондамі нашай бібліятэкі.

**— І ўсё ж студэнты прызвычаіліся больш давяраць Ленінцы...**

— Так, калі трэба знайсці для падрыхтоўкі да семінара ці практычных заняткаў дадатковую літаратуру — Нацыянальная бібліятэка валодае большай колькасцю малатыражнай літаратуры.

Мы ж па-ранейшаму набываем новую літаратуру, але колькасць яе не такая ўжо вялікая. Дорага. Так што ў хуткім часе будзем вымушаны ўвесці грашовае пакаранне для тых, хто доўгі час не вяртае дэфіцытную кнігу ў бібліятэку.

**— А часам здараецца, што на запыт бібліятэкары адказваюць: «Кнігі няма на месцы». Дык дзе ж яна тады?**

— Гэта для нас самае балючае пытанне. Кнігасховішча разлічана на 500 тысяч экземпляраў, а мы захоўваем звыш 2 мільёнаў. Вось і «няма кнігі на месцы», таму што вызначыць для яе месца вельмі цяжка.

**Т. КАЗАК.**

АНОНС



*Не крыўдуйцеся, дзяўчаты, што размова пра мужчын...*
*2-я і 3-я старонкі*



*Што такое жаночае шчасце? Ліка ЯЛІНСКАЯ разумее па-свойму...*
*4-я старонка «Аўдыторыя № 7».*

ПРОЗА ЖЫЦЦЯ

## НІШТО НЕ ВЕЧНАЕ...

**Чуткі аб чарговым павышэнні аплаты за пражыванне ў інтэрнаце папаўзлі па ўніверсітэце пасля канікулаў. І называліся такія лічбы, што...**

Каб чуткі сталі інфармацыяй, іх патрэбна пацвердзіць альбо абвергнуць. Як паведаміла кіраўніцтва студэнцкага гарадка, са студзеня павышана аплата за інтэрнат. Прычын называлі многа, але дастаткова адзінага слова — інфляцыя. Зараз вядзецца пераразлік і хутка стануць вядомымі новыя расцэнкі. Можна ўжо не сумнявацца, што яны будуць не ніжэй за 240 рублёў у месяц.

Здаецца, у хуткім часе на шыльдзе студэнцкага інтэрната можна будзе напісаць «Гасцініца».

## АПЕРАЦЫЯ «ПЕШАХОД»

**У 1992 годзе ў Мінску 61 працэнт усіх дарожна-транспартных здарэнняў, калі былі пацярпеўшыя, здзейснена па віне пешаходаў.**

Таму ў лютым з мэтай папярэдзіць парушэнні правілаў дарожнага руху праводзілася аперацыя «Пешаход». Дарэчы, такія парушэнні каштуюць зараз парушальніку 150 рублёў, віноўніку стварэння аварыйнай абстаноўкі — ад 300 да 750 рублёў, а з нанясеннем лёгкіх цялесных пашкоджанняў ці невялікага матэрыяльнага ўрону — ад 1,5 да 4,5 тысяч рублёў.

Аднак і гэтыя крайнія меры, на жаль, не заўсёды дапамагаюць у барацьбе з парушальнікамі. За тры тыдні лютага ў Мінску адбылося 304 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам пешаходаў (6 загінуўшых, 28 параненых). Лічбы па Маскоўскім раёне — адпаведна 4 (1 і 3).

**А. СЛЕСАРЭНКА,**
**начальнік аддзела**
**ДАІ Маскоўскага РАУС.**

А ВЫ І НЕ ЧУЛІ

## СЁННЯ Ў НАШАЙ ХАЦЕ СВЯТА

***З гэтага года павялічылася колькасць святочных дзён — 15 лютага, на Стрэчанне, аб'яўлена сусветным днём праваслаўнай моладзі.***

Рашэнне было прынята на сустрэчы прадстаўнікоў усіх праваслаўных арганізацый Беларусі, а таксама некалькіх гарадоў Расіі, якая адбылася ў памяшканні гістфака нашага універсітэта.

Прывітальным словам пасяджэнне адкрыў Мітрапаліт Філарэт. Даклад аб руху праваслаўных хрысціян зрабіў адзін з выдатных рэлігійных дзеячаў Расіі настаяцель Патрыяршага сабора ў Маскве айцец Віталь Баравы.

**З. МАРАВА.**



У СУСЕДЗЯЎ

**Вышэйшы каледж мастацтваў і хрысціянскай культуры святога Георгія Панашы пачаў дзейнічаць у Заслаўі.**

**Дырэктар каледжа Валерый Залатар і выкладчык Іна Войцкая складалі праграму навучання, выбіраючы ўсё самае лепшае і прыймальнае з заходнееўрапейскай і амерыканскай сістэм навучання. Першыя тры гады вывучаюцца асновы багаслоўя, розных культур, мовы, а потым, зыходзячы з фінансавых магчымасцей і асабістых жаданняў, навучэнцы выбіраюць сабе спецыяльнасці і час навучання на наступных этапах, але галоўным для выкладчыкаў з'яўляецца ўсё ж выхаванне чалавека творчага, здольнага разумець свет.**

ВУЧЫЦЦА — НЕ ВУЧЫЦЦА

## Вышэйшая адукацыя: прэстыж падае

***Толькі за мінулы навучальны год БДУ пакінулі 170 студэнтаў. Калі дадаць яшчэ адлічаных за акадэмічную непаспяховасць, лічба ўзрастае да 448 чалавек.***

*Няўжо таленавіты ў абітурыенцкія часы студэнт няздольны засвоіць аб'ём ведаў, прадугледжаны вучэбнай праграмай ВНУ? Здараецца. Але ж у абыякавасці да вучобы адыгрывае значную ролю яшчэ і няўпэўненасць у тым, што заўтра (пасля заканчэння навучальнай установы) падвернецца магчымасць працаўладкавацца. Асцярога зусім не беспадстаўная: у чэрвені мінулага года ў ліку беспрацоўных з вышэйшай адукацыяй было 104 выпускнікі ВНУ, а ў кастрычніку — 903.*

*Аднак нават шчаслiўчыкаў, якім пашанцавала з месцам работы, чакае сюрпрыз — дыпламаваны спецыяліст атрымлівае сёння не больш, чым яго калега без вышэйшай адукацыі, ды й сам узровень гэтай зарплаты пакідае жадаць лепшага. Ці ёсць тады сэнс у пяцігадовым бадзянні па бібліятэках і інтэрнацкіх чыталках, харчаванні ў сталоўках і набыцці вялікай колькасці захворванняў, якія застануцца спадарожнікамі на ўсё астатняе жыццё?*

*Трэцім ворагам для тых, хто прагне вучыцца, каб атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, становіцца цяжкае матэрыяльнае становішча ўсё большай часткі насельніцтва. Пакінутыя на волю лёсу ўрадам, які «ўзнагароджвае» мізэрнай стыпендыяй (яе не хапае не тое што на жыццё, нават на харчаванне), і бацькамі (ці многа ў нас студэнтаў з забяспечаных сем'яў?), маладыя людзі вымушаны шукаць выйсце самастойна. Бяда не толькі ў тым, што многія, здабываючы грашовыя сродкі, зварочваюць на злачынны шлях, але і ў тым, што сумяшчальніцтва работы з вучобай адразу ж адбіваецца на паспяховасці. Нярэдка перавага аддаецца стабільнаму матэрыяльнаму забеспячэнню.*

*Ці можна зацікавіць сённяшняга студэнта і заўтрашняга абітурыента і падняць прэстыж вышэйшай адукацыі? Прапануюць увесці плату за навучанне. Найбольш прыймальны варыянт, які азмрочваецца адсутнасцю гарантый, што навучанне стане больш эфектыўным, паколькі «кульгае» не толькі ўзровень матэрыяльнай базы, але і выкладання. І хто сказаў, што месцы ў ВНУ не захопяць уладальнікі тоўстых кашалькоў? Пакуль урад вагаецца, колькасць дыпламаваных грузчыкаў, фарцоўшчыкаў, беспрацоўных і эмігрантаў па-ранейшаму ўзрастае. Прэстыж жа вышэйшай адукацыі — падае.*

**Алег ЗАЙЦАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

СЛУЖБА 03

## ДРЭННА, ШТО ДЭКАНАТЫ ПАВЯРНУЛІСЯ СПІНОЙ ДА МЕДЫЦЫНЫ

***Непрыемны факт: Мінск стаў эпіцэнтрм эпідэміі грыпа. У выніку штодзённа дзясяткі тысяч гараджан — непрацаздольныя.***

Можа падацца дзіўным, але ва універсітэце пакуль хворых на грып не надта многа: ні пад час канікулаў, ні ў першы месяц вучобы. Але супакойвацца пакуль не варта, бо ў запоўненых аўдыторыях шанц падхапіць хваробу ўзрастае ў некалькі разоў.

Н. І. Гарулёва, загадчыца 3 тэрапеўтычнага аддзялення засяродзіла ўвагу яшчэ на аднай вострай праблеме — праходжэнні флюараграфіі.

Згодна з загадам гарвыканкома, прадстаўнікі групы рызыкі (а сярод іх і студэнты) раз у год павінны праходзіць флюарагарафічнае абследаванне. Але ў мінулым годзе гэтая кампанія ва універсітэце была сарвана. Найбольш «вызначыліся» гістарычны і юрыдычны факультэты. Ды і астатнія, за выключэннем ФЭФа, недалёка сталі.

Дэканы факультэтаў, зразумела, атрымалі спісы тых, хто ігнараваў флюарагарафію. Але на сённяшні дзень станоўчых змен амаль не адбылося. Расце, між тым, колькасць хворых на туберкулёз. На думку Гарулёвай, самае дрэннае, ў гэтай сітуацыі тое, што дэканаты павярнуліся да медыцыны спіной.

**МОЖНА БЫЦЬ УПЭЎНЕНЫМ: КАЛІ Б НЕ БЫЛО НА ЗЯМЛІ ЖАНЧЫН, НЕ БЫЛО Б ЛІТАРАТУРЫ І ЖЫВАПІСУ, СКУЛЬПТУРЫ І МУЗЫКІ, НЕ БЫЛО Б ФАРБАЎ, ГУКАЎ, СЛОЎ — НІЧОГА НЕ БЫЛО Б. ЖАНЧЫНА ЗАЎСЁДЫ ПАКІДАЕ СЛЕД У ЖЫЦЦІ МУЖЧЫНЫ, А Ў МНОГІХ ВЫПАДКАХ СКЛАДАЕ ЎВЕСЬ ЯГО ЗМЕСТ, СУПРАВАДЖАЮЧЫ ЯГО ПА ЖЫЦЦІ.**

**А ВЫ ЗМАГЛІ Б?**

# ВЯЛІКАЕ КАХАННЕ ВЯЛІКІХ МУЖЧЫН

Паэт, пра якога можна сказаць, што жанчыны былі ў яго жыцці усё і нічога адначасова — Гарацый. Ён не быў жанаты, а калі ўспомніць яго каханак, то іх было так многа, што спыніцца на якой-небудзь адной амаль немагчыма. Яны ўсе былі блізкімі яму, усім ім ён спяваў урачыстыя гімны і дарыў эратычнае каханне, якім была пранікнута ўся яго істота, як у сапраўднага прадстаўніка стагоддзя Аўгуста. Ці трэба падкрэсліваць, што ўсё гэта былі гетэры? У часы Гарацыя жанчына не іграла амаль ніякай ролі, за выключэннем адной — яна была гаспадыняй у каханні. У асяроддзі менавіта такіх жанчын знаходзіў Гарацый сваю крыніцу натхнення.

У гісторыі адносін паміж жанчынамі і вядомымі прадстаўнікамі культуры наўрад ці можна знайсці такі яскравы прыклад палымянага і ў той жа час ідэальнага і платанічнага кахання, якое вялікі італьянскі паэт Дантэ меў да Беатрычы. Цяжка нават назваць гэта пачуццё каханнем. З тае пары, як існуе чалавецтва, узаемаадносіны паміж мужчынамі і жанчынамі выяўляліся ў самых розных формах. Але ні ў адным з гэтых выпадкаў каханне не дасягала той сілы напружання, як у адносінах Дантэ да сваёй каханай. Ці не таму доўгі час не хацелі нават верыць, што Беатрычы сапраўдная асоба і называлі яе ідэальным уяўленнем ідэальнай жанчыны. Дантэ ж не быў нават з ёй знаёмы! І пачаў кахаць яшчэ з дзяцінства, аднак зразумеў свае пачуцці куды пазней. Увесь час ён утойваў імя дзяўчыны, у якую быў закаханы. Беатрычы памерла маладой, у дваццаць тры гады. Яна ніколі не хварэла, проста таяла і згарэла, як свечка. Дантэ доўга аплакваў сваё каханне. Сваё гора ён выразіў у цудоўных санетах і суцяшаў сябе думкай, што напіша твор, у якім пакажа Беатрычы такой, якой не была прадстаўлена ніводная жанчына. І ён напісаў «Боскую камедыю»...

Вядомы англійскі мастак Уільям Блэйк неяк скардзіўся сваёй будучай жонцы Кацярыне Бучэр на пакуты, што прыносіць яму адна асоба, да якой ён неабыякавы.

— Мне вас шкада,— адказала цемнавокая Кацярына.

— Праўда? — зацікавіўся Блэйк.— За гэта я вас вельмі люблю.

— А я вас таксама кахаю,— адказала дзяўчына.

Блэйк, доўга не думаючы, вырашыў жаніцца на ёй. Ён намаляваў яе партрэт, апісаў яе прыгажосць у вершаванай форме. Кацярына стала добрай жонкай. Яна не патрабавала шыкоўных туалетаў, заўсёды заставалася вясёлай і жыццярадаснай. Адзінае, што яе хвалявала,— творчасць мужа, яго слава, у чым яна прымала непасрэдны ўдзел. Толькі ёй адной давяраў Брэйк тайну сваёй палітры. Ён памёр у 71 год. Апошнімі яго словамі былі: «Адзінае мяне хвалюе: што я пакідаю цябе тут. Мы доўга і шчасліва жылі». За тры дні да смерці ён, лежачы ў ложку, рабіў апошнія штрыхі да сваёй любімай карціны. Яго жонка разрыдалася.

— Пачакай, Кэці! — сказаў Уільям.— Не рухайся з месца. Мне хацелася б на развітанне намаляваць яшчэ адзін твой партрэт, бо ты заўсёды была маім анёлам.

І, паміраючы, мастак напісаў адзін з самых удалых партрэтаў Кацярыны...

Купер, творамі якога яшчэ доўга будуць зачытвацца, наўрад ці стаў бы пісьменнікам, калі б не яго жонка. Аднойчы ў яе прысутнасці ён чытаў нейкі раман. Твор быў благі, і ён з прыкрасцю кінуў яго на падлогу.

— Што за брыдата! — закрычаў ён.— Я не раманіст, але магу паспрачацца, што напісаў бы значна лепшы раман.

— Дык у чым праблема? Дакажы! — кінула жонка.

Праз некалькі дзён ужо былі напісаны некалькі глаў «Перасцярогі» — кнігі, якую Купер выдаў за ўласныя сродкі. Раман не засяродзіў на сябе шмат увагі, але падштурхнуў таленавітага пісьменніка на шлях белетрыстыкі, дзе яго чакала слава. Ужо наступны яго раман, «Шпіён», меў куды больш поспех...

Знакаміты філосаф утылітарызму Іерэлія Бэнтам меў рэдкае пастаянства сэрца. Ён пакахаў адну жанчыну яшчэ зусім маладым. Прасіў яе рукі, але атрымаў адмову. З таго часу ён не пераставаў суцяшаць сябе думкай, што рана ці позна будзе мужам каханай дзяўчыны. Калі яму споўнілася шэсцьдзесят год, ён зноў пацвердзіў сваю прапанову, але выбранніца зноў яму адмовіла. Бэнтам не мог гаварыць пра яе спакойна, кожны раз, калі ўспамінаў яе, на яго вачах выступалі слёзы. У восемдзесят год ён напісаў ёй ліст, у якім ёсць такія словы: «Я яшчэ жывы; мне ўжо больш за восемдзесят, і, тым не менш, у мяне такія ж палымяныя пачуцці, як і тады, калі вы падарылі мне на лузе кветку. З тае пары не прайшло ні дня (пра ночы я ўжо не кажу), каб вы не займалі маіх думак болей, чым гэта было мне карысна...»



Англійскі палітычны дзеяч лорд Чэрчыль значнай часткай сваёй папулярнасці абавязаны жонцы, цудоўнай амерыканцы, прыгажосць якой уражвала ўсіх. Джэні Джэром — так звалі яе да жаніцьбы — была старэйшай дачкой амерыканскага мільянера. З будучым мужам яна пазнаёмілася на званым абедзе ў Парыжы. Хаця малады яшчэ ў той час дзяржаўны дзеяч не надта захапляўся дамамі, знаходлівая і жывая амерыканка звярнула на сябе яго ўвагу цікавай гутаркай на добрай французскай мове. Па дарозе дадому ён сказаў свайму сябру: «Гэта разумнейшая з дзяўчат, якіх я калі-небудзь бачыў». У сваю чаргу, і ён спадабаўся Джэні, і яна ахвотна прыняла яго прапанову. Як сведчыць сам Чэрчыль, яго жонка была найлепшым выбарным агентам. Дзякуючы яе агітацыі, ён аднойчы быў выбраны ў парламент...

...Дзе той мужчына, які, прайшоўшы праз жаночы ўплыў, не стане чысты сэрцам і душою!

**Падрыхтаваў А. ЮРЫН.**

**З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ МУЖЧЫНЫ**

# КАЛІ ХОЧАЦЦА ПЛАКАЦЬ — СПЯВАЙЦЕ!

***Жаночае свята — сапраўднае там, дзе многа жанчын. Юных і не вельмі. Таму мы і накіраваліся напярэдадні на філфак. Як жывецца мужчыне — дэкану амаль жаночага факультэта? Паслухайце*** **Алега Антонавіча ЛОЙКУ.**

**— Алег Антонавіч, у вас, напэўна, вельмі складана з дысцыплінай: дзяўчаты ўвесь час спазняюцца, на заліках плачуць, на экзаменах — рыдаюць...**

— Што вы! У нас на філфаку семестр пачаўся са стопрацэнтнай яўкі і без адзінага спазнення. І паспяховасць на факультэце ў параўнанні з мінулым годам на 5 працэнтаў узрасла. Вельмі я задаволены. Асабліва першымі трыма курсамі. А такіх артыстачак, каб выплакаць адзнаку, у нас мала. Ды і навошта выплакваць, калі можна «выспяваць»? Арыгінальна, з густам. Такая ёсць форма прымання іспыту. У мяне спяваюць на краязнаўстве: сольна ці хорам.

**— Ды й калектыў выкладчыкаў у вас «слабы». Як вы ацэньваеце ўмовы сваёй працы: як занадта шкодныя, ці ў нечым зайздросныя для дэканаў іншых факультэтаў?**

— Каб сказаць, што прэвалюе у нас сярод выкладчыкаў слабая палова чалавецтва — не. Але ж вельмі добра, што нашы мужчыны пад уплывам жанчын больш лагодныя, чым іншыя. З другога боку і ў жанчын ёсць стымул рабіцца больш строгімі.

**— Ведаеце, я б на вашым месцы крыху змяніла навучальны працэс на факультэце, зрабіўшы ўхіл на выхаванне не столькі спецыялістаў-філолагаў, колькі высакародных дзяўчын. Як вы лічыце?**

— Я ўпэўнены: настаўніца павінна быць прыгожай. Без голасу ніхто не рыхтуецца да паступлення ў кансерваторыю. Без таленту ў жывапісу ніхто не імкнецца стаць мастаком. А настаўнікам, акрамя прафесійных якасцей, трэба мець і выдатныя знешнія дадзеныя. У некаторых краінах існуе нават конкурс на прыгажосць. На ўступных экзаменах, між іншым.

Памятаю, калі быў малы, у мяне была такая прыгожая, добрая настаўніца. А ў старэйшых класах не хацелася нават у школу хадзіць: настаўніца злосная такая была. Я мяркую, менавіта таму, што не прыгожая.

**— А на заканчэнні размовы Алег Антонавіч пажадаў:**

— Спаўнення ўсіх жаночых—дзявочых мараў. Усё, што на радасць жанчыне, няхай здзейсніцца!

Асаблівыя пажаданні жанчынам-навукоўцам. У хуткім часе і яны стануць беларускімі лэдзі. А студэнтачкам — вы пачалі са слёз — слёз радасці.

**Гутарку вяла Таццяна КАЗАК.**

# ЖНЯВО ПАЧНЕЦЦА 8 САКАВІКА

*У папярэдніх нумарах «Беларускі універсітэт» ужо папярэджваў сусветную грамадскасць аб тым, што ў Цэнтры маладзёжных ініцыятыў спеюць «глабальныя ідэі» з нагоды 8 сакавіка. Сёння мы паведамляем аб гэтым падрабязна. Наш субяседнік — Іван РАК.*

**— Па-першае, нам хочацца даведацца, якія ўсё ж такі «глабальныя ідэі» спеюць у Цэнтры маладзёжных ініцыятыў?**

— Усё будзе вельмі сціпла, але з густам. Будзе танцавальна-забаўляльная праграма, бары з халоднымі і гарачымі напіткамі, шампанскім, піражанымі, марожаным.

**— А чаму ідэі спеюць менавіта да 8 сакавіка? У іх што, тэрмін паспявання такі?**

— Справа ў тым, што наш цэнтр — не камерцыйная арганізацыя і праводзіць такія мерапрыемствы кожны месяц вельмі стратна.

**— Значыць, дзяўчаты ва універсітэце асаблівыя? Не для кожных жа такое свята захочацца зрабіць?**

— Ну, мы так мяркуем, што калі не мы, то нашых дзяўчат і жанчын, сапраўды, ніхто не павіншуе. І вырашылі пайсці на гэта, нават нягледзячы на вялікія страты.

**— А сваіх дзяўчат збіраецеся віншаваць?**

— Павіншуем, безумоўна. Купім нашым дарагім жанчынам дарагія кветкі, а можа, кілаграм апельсінаў. А, можа, яшчэ што-небудзь.

**У СВЕЦЕ ВЫШЭЙШАЙ МОДЫ**

# СУМНАЯ ФАНТАЗІЯ НА ТЭМУ «ЛАНКОМ»

***Складана даводзіцца сёння нашым жанчынам. Шматгадовае знаходжанне на вялікай адлегласці ад цэнтраў сусветнай моды пакінула свой адбітак. Як проста было раней стаць элегантнай: купіў шклянку духоў «Красная Москва» ці «Ландыш» ці «Жасмин» — усё роўна (пах жа аднолькавы), памаду «Кокетка». А каму недастаткова, можна было знайсці яшчэ штосьці падобнае. Усё надвор'е ў савецкай модзе рабілі некалькі фабрык.***

Зараз ужо не тое. Рынак стаў больш багатым, ён прапануе жанчынам мноства магчымасцей праявіць сваю індывідуальнасць, стварыць свой непаўторны воблік. Па маіх уласных назіраннях жанчыны па метадах і сродках стварэння свайго вобразу падзяляюцца на тры тыпы. Першы тып — гэта жанчыны з грашыма, а часцей без іх, якіх аб'ядноўвае адно: поўная адсутнасць якога-небудзь густу. Гэты тып купляе сабе духі і іншую парфуму ў камерцыйных крамах, дзе вядомыя «Мажы нуар» каштуюць не больш за 100 рублёў. І калі патрымаеш у руках гэтую неадмысловую скрыначку, то адразу адчуваеш: так, гэта сапраўды — «Мажы нуар»... Савецкага, польскага ці якога іншага мага.

Другі тып жанчын — гэта тыя, у якіх недастаткова грошай, але дастаткова густу, каб замест грубай падробкі знайсці пядрэнную парфуму айчыннай вытворчасці.

Трэці тып жанчын. Прырода адарыла іх вытанчаным густам, а клапатлівыя бацькі ці мужчыны, якія вельмі іх кахаюць, дастатковай сумай грошай.

Неяк здуру, цяпер нават не магу ўспомніць чаму, палічыўшы, што таксама належу да апошняга тыпу, я накіравалася да «Ланкома». Калі вы былі нядаўна на вуліцы Куйбышава, то напэўна бачылі гэты магазін. Ён так спакусліва вабіць цудоўна выкананымі вітрынамі.

Зразумела, я не аднойчы ўжо была ў падобных магазінах і, ведаючы сваю рэакцыю, папярэджвала сама сябе: галоўнае — не пакінуць абутак перад уваходам. Але не дапамагло: жаданне такое ўсё ж такі ўзнікла. Я мужна перанесла тыя пакутлівыя хвіліны ўваходу ў магазін, калі ты адчыняеш дзверы і імкнешся прасунуцца так, каб ніхто не заўважыў, у бліскучы ад чысціні і прыгажосці салон і ледзь-ледзь кранаючы падлогу, накіроўваешся да прылаўка. І ўсё роўна пакідаеш за сабой плямы розных формаў і памераў. На цябе глядзіць некалькі пар вачэй з другога боку прылаўка, і гэтыя вочы пачынаюць акругляцца, а ўсмешка, з некалі ветлівага твару, знікаць. Ты працягваеш свой шлях наперад і неяк вінавата ціснешся да сцен і падлогі адначасова. У такім стане першыя некалькі прылаўкаў разглядваеш механічна, цэны яшчэ не даходзяць да тваёй свядомасці. Галоўная задача на гэтым этапе — рабіць выгляд, што ты не заўважаеш сваёй недарэчнасці сярод гэтай французскай шыкоўнасці і чакаць, пакуль у дзвярах не з'явіцца хто-небудзь іншы. Але нарэшце вочы пачынаюць акругляцца ў цябе. Духі «Climat» — 25.000... Фу!... рублёў. «Мажы нуар» — амаль столькі ж. Крэм — 6 тысяч. Так. Пакуль хапае толькі на памаду. Колькі яна там каштуе: 1.500 ці 3.500 — ужо не памятаю. Божа! За памаду — 3.500! Не! Мужчынскі ласьён за 14.500 і даражэй. Якое шчасце, што 23 лютага ўжо мінавала. Дзякуй богу, што яшчэ прадаўцы не чапляюцца, прапаноўваючы свой тавар. А чаго я пужаюся? Хіба па мне не відаць, што да мяне чапляйся не чапляйся.. Усё роўна трэба рабіць адсюль ногі.



Ля ўваходу ў «Ланком» прыпаркоўваліся ўсё новыя машыны, з іх выходзілі жанчыны трэцяга тыпу. Я з зайдрасцю глядзела ім услед. Ну, бог з імі, з духамі. Тут, канешне, цэны ніжэйшыя, чым у валютным магазіне, але ж нічога новага, супермоднага няма. Усе духі мне вядомыя, гадоў 10 таму назад іх можна было набыць у нашым гандлі па 25 рублёў за штуку. У мяне яшчэ засталося, калі буду эканоміць, хопіць да пенсіі. Крэмы?.. Крэмы, крэмы, крэмы... Не трэба так хвалявацца. Лепш я на гэтыя 6 тысяч, якіх у мяне няма, куплю натуральных сокаў, апельсінаў, яблыкаў.. Не, не дапамагае. У любым выпадку, якімі крэмамі і духамі не карыстайся прыродную абаяльнасць не страціш і прыгажэйшай не станеш.

Станеш... станеш... станеш... Ну чаго мяне занесла ў гэты магазін?! Яшчэ, не дай бог, галадаць пачну, адкладваць грошы са стыпендыі. На ілбе ўжо маршчыны з'явіліся. Усё — ша! Ніякіх «ланкомаў». Толькі «фантазія».

**Вольга УЛЕВІЧ.**

## ТАК ЗАВАЁЎВАЮЦЦА СЭРЦЫ

# ЦЯЖКІ ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

***Як звярнуць на сябе яго ўвагу, калі Ён безнадзейна няўважлівы?***

*Цікаўныя эксперыменты паставілі, напрыклад, у Цехасе. Тут з дапамогай сучаснай тэхнікі была створана мадэль знаёмства. Даследчыкі падыйшлі да справы з сапраўдным амерыканскім размахам. На відэастужку былі запісаны дыялогі некалькі соцень жанчын і мужчын. Вынікі дасканала прааналізавалі псіхолагі.*

*На думку кавалера, дзяўчына, якая першая запрасіла новага знаёмага на спатканне, ацэньвалася, як правіла, прывабнай, гаваркой, добразычлівай. Мужчыны аказаліся вельмі ўспрымальнымі нават да інтанацый, з якімі ладзілася размова.*

*«Ніколі не хавайце свайго інтэлекту, — робяць вывад псіхолагі. — У разумнай, актыўнай жанчыны заўсёды ёсць перавага перад саперніцамі. Калі яна першай прызначае спатканне, то можа не хвалявацца, што яе намеры будуць вытлумачаны памылкова.*

*Нягледзячы на рэкамендацыі вучоных, прадстаўніцы прыгожага полу саромеюцца браць на сябе ініцыятыву пры знаёмстве. Толькі 3 працэнты ўдзельніц эксперыменту адважыліся запрасіць сваіх суразмоўцаў на спатканне. А шкада! 95 мужчынам са 100 падабаецца, калі жанчыны пачынаюць дзейнічаць першымі, і гэтым самым вызваляюць моцны пол ад неабходнасці самім рабіць рашаючы крок...*

### *МІНІ-ПРАГРАМА ДЛЯ МАКСІ-ПОСПЕХУ*

*У першую чаргу я выкінула пачак з цыгарэтамі.*

*Скараціла ўжыванне солі і цукру.*

*Нягледзячы на тое, што люблю позна прачынацца і вельмі позна класціся спаць, прымусіла сябе спаць па 7—8 гадзін у суткі.*

*Уключыла ў меню цытрусавыя, бо яны багатыя на вітамін С, а калі не было магчымасці іх знайсці — прымала таблеткі аскарбінавай кіслаты.*

*Ранішнюю гімнастыку, якую ўсё роўна не паспяваю займацца, замяніла абавязковай хуткай хадой па вуліцы.*

*Пад забаронай — ліфт. Лесвіца — вельмі зручны і бясплатны трэнажор.*

*Выпіваю ў дзень не менш за 7 шклянак вадкасці. Перавагу аддаю настоям з траў.*

*Набыла зручную шчотку для валасоў і расчэсваю перад сном валасы ў напрамку да макушкі. Не менш як 100 узмахаў.*

*І — думаю пра сябе, як пра самую прыгожую жанчыну, імкнуся ўвесь дзень усміхацца і не паддавацца сумным думкам.*

## СВЕЦКІЯ ПЛЁТКІ

# Прадаецца... муж

«Прадам амаль новага мужа за добрую цану» — такую аб'яву памясціла нейкая Мэры Сміт у газеце гарадка Барроў, што ў Англіі.

Попыт на незвычайны тавар пераўзышоў усе чаканні: менеи чым за гадзіну англічанцы патэлефанавалі трыццаць жадаючых набыць яго, нягледзячы на тое, што ў аб'яве ўказвалася прычына продажу — місцер Сміт аказаўся гультаём.

Сам «прадмет» торга зусім не пакрыўдзіўся на сваю энергічную палавіну, ды й на новых прэтэндэнтак на яго персону таксама. Аднак пад удзеяннем таго, што адбылося, ён усё ж прымусіў сябе заняцца некаторымі хатнімі справамі.

# НОРКА ДОБРА — ВЫДРА ЛЕПШ

А я, сяброўкі, футрачку сабе набыла — усё жыццё шкадаваць буду. Бо ў гэтай нутрыі, каб яе ў магазіне ніхто не купляў, працэнт мацунку ўсяго 40. Так што, калі грошай назбіраеце, прыхапіце з сабой наступную табліцу:

Выдра — 100, коцік — 85, норка — 70, куніца — 60, андатра — 45, белка — 40, гарнастай — 25, бабёр — 90, песец — 60, каракуль — 50, нутрыя — 40, трус — 12, заяц — 5.

Што прыносіць жанчыне найвышэйшую асалоду, калі не магчымасць абмеркаваць свае (а заадно ў чужыя) праблемы з лепшай сяброўкай? У нашым выпадку гаворка адбылася на міжнародным узроўні. Пляткарка-англічанка беларускую «калегу» сустрэла — ад радасці ўся пасвятлела. А хто якой навінай падзяліўся — здагадвацца вам.

## ПАСПРАБУЙЦЕ!

# МАРШЧЫН МОЖА І НЕ БЫЦЬ

***Перад вамі рэцэпт навінкі хатняй касметыкі — крэма, які аблузваецца сам. Ён у стане стварыць цуд.***

**Яго лёгка зрабіць самой. Змяшайце палову стакана кефіра, а калі ёсць магчымасць — смятанкі з 350 грамамі солі. Сільнымі рухамі ўцярыце яго ў скуру, тыя часткі, якія арагавелі, апрацуйце асабліва руплiва. Будзьце асцярожнымі. Скура твару патрабуе беражлівых адносін, інакш яна адрэагуе раздражненнем. А цяпер змыйце састаў вадой хатняй тэмпературы, нанясіце пажыўны крэм і вы будзеце здзіўлены! Скура стане пругкай, маршчынкі разгладзяцца.**

**Чым гэта растлумачыць? Сумесь аблузвае тыя часцінкі скуры, якія адмерлі. Менавіта яны — віноўнікі таго, што скура выглядае вялай. Узмацняецца таксама і рэгенерацыя (аднаўленне) клетак, якая з узростам замаруджваецца. Скура лепш забяспечваецца крывёй.**

## СВЕЦКІЯ ПЛЁТКІ

# МОДА З БАРАДОЙ

Болей за 70 працэнтаў амерыканак афарбоўваюць свае валасы ў другі колер. Мода гэтая вельмі-вельмі старая. Скажам, старажытнагрэчаскія палітыкі любілі пераўтварацца ў бландзінаў, рымляне аддавалі перавагу магчымасці пафарсіць брунетамі. Старажытныя германцы рабілі зялёныя і жоўтыя прычоскі, а вось галам быў даспадобы ярка-рыжы каларыт.



## ХТО ТЫ ТАКІ?

**Як здагадацца, з якім мужчынам табе будзе заўсёды добра, а з якім жыццё будзе прыносіць толькі засмучэнні? Вельмі проста — неабходна пастаянна імкнуцца на ўсім засяродзіць увагу, і тады можна адказаць на гэтае пытанне з вызначанай доляй упэўненасці.**

**Зразумела, нельга задаваць пытанні мужчыне, але ў гутарках, як вядзецца, многае спасцігаеш. Тут кожнае слова мае значэнне.**

**Калі вам нешта не падабаецца ў характары вашага выбранніка, не думайце, што у вашых сілах яго выправіць,— гэты разлік амаль заўсёды не спраўджваецца.**



# ТАЯМНІЦЫ МОЦНАГА ПОЛА

## ці Аб чым мужчыны заўсёды маўчаць

***Даваць парады — справа марная. Асабліва, калі гэта датычыць праблемы выбара спадарожніка на ўсё жыццё.***

***І усё ж, мілыя жанчыны, паспрабуйце сур'ёзна паставіцца да таго, што рэкамендуе амерыканскі часопіс «Касмапалітэн».***

***«Прыгнечаны»***

Гэта хутчэй не тып, а пераходнае становішча. Калі вы вырашылі сустракацца з мужчынам, які нядаўна развёўся ці быў пакінуты іншай жанчынай, будзьце гатовымі да таго, што ў кожны момант ён можа адчуць сябе «не ў сваёй талерцы» ці выйсці з сябе з-за дробязі. Калі такі мужчына вам падабаецца і вы падрыхтаваліся да таго, каб выслухоўваць бясконцыя маналогі-разважанні аб тым, «што ж усё ж такі здарылася», не кідайце яго. Але і не вабьце з ім увесь вольны час.

***«Дзелавы»***

Гэты лічыць сябе моцным і амаль усемагутным, таму што можа заказаць столік у рэстаране і дабівaецца поспехаў у жыцці. Ён агрэсіўны і імкнецца дамініраваць ва ўсім. Падыход да жанчыны адзіны: ці прымаеш мяне цалкам, такім, які я ёсць, ці давай развітвацца. Ён жадае, каб аднаму яму належыла апошняе слова — як выхоўваць дзяцей, куды паехаць у адпачынак, калі запрасіць у госці сваякоў. З ім усё добра, пакуль усё ў парадку з яго справамі, але нават маленькае паражэнне на вашых вачах пераўтворыць яго ў прыгнечанага, няўпэўненага ў сабе чалавека. Будзьце ўважлівымі: каб гэты «дзелавы» не пачаў ставіцца да вас усяго толькі як да свайго трапнага «набытку».

***«Выдатнік»***

Гэты імкнецца давесці ўсё да дасканаласці. Калі такі звернецца ў бюро знаёмстваў, дык абавязкова складзе цэлы аркуш якасцяў, якімі павінна валодаць яго выбранніца. Калі ж камп'ютэр знойдзе для яго падыходзячую кандыдатуру, дык пасля сустрэчы з ёй, ён абавязкова скажа нешта падобнае на: «Акрамя вышэйназваных якасцей, мне падабаюцца ў жанчын доўгія інтэлігентныя пальцы...» Часта ён уяўляе сябе Пігмаліонам, які імкнецца перавярнуць на свой манер прычоску, стыль вопраткі і нават густы жанчыны, з якой ён сустракаецца. Звычайна, дарэчы, яна павінна быць значна маладзейшай, чым ён. Сустракацца з «выдатнікам» лепш за ўсё той жанчыне, якая сапраўды лічыць яго прыкладам і ўзорам для пераймання і верыць яму, як самаму любімаму настаўніку. Калі ж у яе не хапае ўпэўненасці ў сабе ці яна знаходзіцца на раздарожжы, тады «выдатнік» — проста знаходка. Галоўная бяспека ў тым, што часцей за ўсё Пігмаліон, удасканаліўшы сваю Галатэю, пачынае пошукі новай...

***«Летуценнік»***

У гэтага ніколі не сходзяцца канцы з канцамі. У яго жыцці заўсёды ёсць нейкі новы праект ці мара, якія правальваюцца яшчэ да таго, як «летуценнік» паспявае пачаць іх рэалізацыю. Спасцігнуць яго не складае ніякай цяжкасці — ён мяняе адно месца працы на другое, ні з кім не можа разам працаваць. Марыць змяніць твар усяго свету, а ў паўсядзённым жыцці часам нават няздольны як след прыняць гасцей. Тым не менш гэта нядрэнны варыянт для жанчыны, якая сама мае ў жыцці акрэсленыя мэты і здольна ўзяць кіраўніцтва сям'ёй на сябе.



***«Брыльянт у пылу»***

Гэты на адным з першых месцаў у сваёй справе. На рабоце яго паважаюць, але часам насмейваюцца. Бо ён «чалавек, які зрабіў сябе сам», праклаў шлях да жыцця доўгай і цяжкай працай. Яму, як правіла, няма яшчэ і саракa, яго касцюм выглядае так, быццам ён у ім спіць, а чаравікі такія брудныя, што цяжка зразумець, якога яны колеру.

«Брыльянту» патрэбна добрая аправа. Часта ён імкнецца знайсці альбо жанчыну, якую зможа апякаць, а яна аб ім клапаціцца, альбо жанчыну «класічнай» прыгажосці, тую што зможа ўзняць яго да свайго ўзроўню, а сама прагне атрымаць ад яго пачуццё трываласці, якога ёй ў жыцці не хапае. «Брыльянты» — выдатныя вучні. Гэта ідэальны выбар для жанчыны, якая не баіцца рызыкі. Але, перш чым распачаць рызыковае прадпрыемства, трэба ўпэўніцца, што «брыльянт» не фальшывы. Інакш гэта рызыка без асаблівай надзеі на поспех.

***«Адказны»***

Ён адчувае на сваіх плячах адказнасць за сям'ю і нават сяброў. Ён так часта тэлефануе бацькам, што тым нават няма на што паскардзіцца. Яго лагічнае мысленне дапамагае ісці па жыцці, амаль не робячы памылак. Калі такі чалавек сустрэнецца на вашым шляху, адразу ж хапайце яго і выходзьце замуж.

***«Ахвяра»***

Гэты можа быць абаяльным і зачараваць амаль адразу. І толькі праз нейкі час вы пачнеце заўважаць, што ва ўсіх яго няўдачах вінаваты нехта іншы. Ён пазбаўлены пачуцця ўдзячнасці і ніколі нікому не скажа «дзякуй». Ён заўважае ў сваім жыцці толькі тых, хто прынёс яму непрыемнасці. Часам ён так устрывожаны і ўсім сваім выглядам так паказвае, што яму патрэбна ваша дапамога, што адмовіць немагчыма. Тады ён пачынае запэўніваць вас і самога сябе, што калі-небудзь усё ж такі ён сустрэне жанчыну, якая б яму падыходзіла. І хоць словы гучаць музыкай, не дазваляйце ёй сябе аглушыць.

Што ж рабіць жанчыне? Зразумець, што ёй падыходзіць больш за ўсё, пачаць пошукі гэтага чалавека, але паспяваць пры гэтым прыглядацца ва ўсе бакі. Калі жанчына будзе пастаянна запэўніваць сябе: «Мне патрэбны высокі і больш багаты», верагодна, што яна застанецца

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

## ЛІКА ЯЛІНСКАЯ:
## «ШЧАСЦЕ...— ГЭТА МАЯ ДАЧКА, СПАКОЙ І СВАБОДА»

***Калі вы думаеце, што «Карамболь» — біл'ярдная гульня, вы не памыляецеся. Але гэта не дакладна. «Карамболь» — гутарковая тэлевізійнае шоу, удзельнікі якога таксама спрабуюць разбіць фігуру, але не біл'ярднымі шарамі, а пытаннямі. І фігуру не абы якую, а вядомую малому і вялікаму замежжу. Такую, напрыклад, як Арцём Троіцкі, Казіміра Прунскене, Генадзь Бураўкін, Юрый Шаўчук... А зусім нядаўна госцяй перадачы была Ліка Ялінская. На гэтую фігуру таксама быў зроблены замах.***

**— Ліка, некалькі год таму назад вы сталі самай прыгожай дзяўчынай Мінска. Гэта быў для вас круты паварот ці крок праз прыступку? А, можа, дзве?**

— Гэта быў крок праз прыступку з крутым паваротам. Пасля конкурсу ў 1988 годзе маё жыццё змянілася кардынальным чынам: Васіль Пятровіч Раінчык запрасіў мяне ў групу «Верасы», давялося развітацца з кар'ерай актрысы, і я пачала працаваць на эстрадзе.

**— На вас, пэўна, звяртаюць увагу, калі вы гуляеце па гораду. Вы адчуваеце закаханыя погляды мужчын і нянавісць жанчын?**

— Які вы вераломны... Ведаеце, мне не даводзіцца гуляць па гораду. Мая прагулка: дом — праца, праца — дом.

**— Вы сустракалі калі-небудзь жанчыну, пра якую вы — першая прыгажуня Мінска — маглі сказаць: гэта сапраўды прыгожая жанчына?**

— Я вельмі крытычна стаўлюся, па-першае, да сябе самой, а па-другое, я была на некалькіх конкурсах, на многіх выставах за мяжой і, шчыра кажучы, не бачыла ні адной жанчыны, перад якой зняла б капялюш.

**— А сябе вы лічыце прыгожай жанчынай?**

— Не, і ніколі не лічыла. Наогул, прыгажосць — такое абстрактнае паняцце... У кожнага свой ідэал прыгажосці.

**— Але гэта вам не перашкаджала ўвесь час жыць у промнях славы... вы, напэўна, былі самай прыгожай дзяўчынкай у школе, у інстытуце... ў вас было шмат паклоннікаў...**

— Не, гэта не так. Мяне ў школе называлі гадкім качанём, я была вельмі нязграбнай дзяўчынкай. А паклоннікаў у мяне зусім не было. Ніхто ніколі не навязваўся, не падакучваў, не чакаў ля пад'езда. Тут многае залежыць ад жанчыны, а я аднялюбка.

**— І гэты адзіны ў вас ужо быў ці ўсё яшчэ наперадзе?**

— Гэта маё асабістае, я магу не адказваць.

**— Зразумела. Тады пытанне іншага плану. Уявіце сабе такую сітуацыю: у вашай кватэры пажар, гарыць ваш гардэроб. Якую рэч вы кінецеся ратаваць у першую чаргу?**

— Ну і хай гарыць — мне нічога не шкада.

**— Як, зусім нічога?**

— Так, мяне нядаўна абрабавалі.

**— Ліка, а вы наогул успрымаеце сённяшняе жыццё, тое, што за вокнамі, ці спрабуеце адасобіцца ва ўласным свеце?**

— Я спрабую не звяртаць увагі на ўсё гэта. Тады больш часу застаецца на працу. Спрабую не думаць аб дрэнным. Чалавеку трэба ж не шмат, больш аднаго абеду ён з'есці не зможа. Існуюць больш каштоўныя рэчы.

**— А што ўяўляе сабой ваша праца?**

— Ой, божа, праца яна і ёсць праца. Гэта маё жыццё, мая асалода...

**— А калі б вы не сталі першай прыгажуняй, чым бы займаліся?**

— Вы думаеце, прыгажосць — галоўнае? Ёсць жа яшчэ душа, розум, абаяльнасць... Думаю, займалася б тым жа.

**— Тады ў чым, на ваш погляд, жаночае шчасце: у працы, у сям'і, у дзецях, у незалежнасці?**

— Шчасце... гэта мая дачка, спакой і свабода.

**— І ў вас хапае часу займацца дзіцём?**

— Мне дапамагае маці. Яна яшчэ маладая і вельмі прывабная жанчына. Сваё жыццё яна прысвяціла мне і маёй творчасці. Дзякуй ёй за гэта.

**— Ліка, я думаю, вы зразумееце аб чым я пытаюся, у вас ёсць сябар, які вам дапамагае ў цяжкую хвіліну, вырашае бытавыя праблемы?**

— Ёсць.

**— У кожнага знакамітага чалавека заўсёды ёсць і нядобразычліўцы, зайздроснікі. Як вы ставіцеся да плётак?**

— Раней я плакала, нават рыдала. Мне здавалася, што нядобразычліўцаў так многа, што нельга дыхаць. Зараз я ўсё ўспрымаю вельмі спакойна.

**— Вы чулі якую-небудзь самую жудасную і неверагодную плётку пра сябе? І што пра вас, наогул, кажуць?**

— Я не магу сабе дазволіць гэта паўтарыць, гэта проста непрыгожа. Спачатку ж казалі, што я настолькі непрыгожая, што мне не толькі на сцэну, на вуліцу нельга паказвацца. Потым аказалася, што спяваць не магу. Потым запела, затое зноў стала непрыгожай. Зараз неяк усё супакоілася: быццам і сама нічога, і розум ёсць. Усё гэта было дасягнута толькі працай і трываннем, вялікім трываннем.

**— Што вам дапамагае захоўваць форму, вы прытрымліваецеся якой-небудзь дыеты?**

— Я ніколі не прытрымлівалася ніякіх дыет. У мяне адваротная праблема: я прымушаю сябе есці, каб быць больш паважнай, але нічога не атрымліваецца.

**— Ліка, сёння вы чароўная і прывабная маладая зорка эстрады. Але праляціць час і, нічога не зробіш, прыйдзе старасць. Вас гэта палохае?**

— Што ж, кожны ўзрост мае свае перавагі. Але я аб гэтым не думаю. Пакуль малады — не думаеш. Я вельмі люблю дзяцей. Магчыма, сваё жыццё я прысвячу ім.

**— У мяне да вас адно стэрэатыпнае пытанне, яго вам, напэўна, задаюць найчасцей: ваш ідэал мужчыны?**

— Мне падабаюцца высакародныя мужчыны.

**— Хуткі ўзлёт папулярнасці не сапсаваў вашу ўласную душу?**

— Ён не. А сама папулярнасць гэтаму спрыяла. У любым выпадку напачатку маёй творчай кар'еры я была больш шчырай у адносінах да людзей і да света наогул.

**— Вам ніколі не хацелася паехаць жыць за мяжу?**

— Не, я не магу вытрымаць за мяжой больш за два тыдні.

**— А калі б паступіла прапанова больш выгадная, чым праца ў «Верасах»...**

— У мяне было шмат такіх прапаноў, асабліва пасля конкурсу «Міс фота СССР»: кантракты ў Англію на тры гады, у Італію і Германію, прапановы ад маскоўскіх прадзюсераў. Я ад усяго гэтага адмовілася. Я люблю свой Мінск, сваю рэспубліку, свой народ, «Верасы» і Васіля Пятровіча Раінчыка, таму — ніколі...

**— Але ж прафесія артыста — гэта даволі складаны занятак: напружаная праца, пастаянная цікаўнасць журналістаў і кантроль з боку гледачоў. Вы задаволены сваім лёсам? Вам ніколі не хацелася спакойнага мяшчанскага шчасця?**

— Якая жанчына не жадае шчасця... Я задаволена сваім лёсам, хаця шмат у ім было складанасцей, але добрага і радаснага больш.

**— Ну а зараз некалькі кароткіх пытанняў, адказы на якія павінны быць такімі ж лаканічнымі.**

— Як позна вы прачынаецеся раніцай?

— Я люблю паспаць.

**— Дзе вы адпачывалі гэтым летам?**

— У Швейцарыі.

**— Што можа давесці вас да слёз?**

— Хамства.

**— Ці шмат часу вы праводзіце на кухні?**

— Вельмі люблю важдацца на кухні, між іншым, у мяне адукацыя — повар-кулінар.

**— Якім часопісам мод вы аддаяце перавагу?**

— Я аддаю перавагу сваёй фантазіі.

**— Што для вас спакуса?**

— Спакуса?

**— Для кагосьці гэта піражнае, таму што трэба захоўваць фігуру...**

— Я, увогуле, вельмі свавольная жанчына.

**— І вы сабе не ў чым не адмаўляеце?**

— Не.

*P. S.* Самым лепшым пытаннем гульні, па капрызу госцці, стала пытанне аб сэнсе жыцця, на якое зорка адказала: «Сэнс жыцця для мяне, як я ўжо казала, у любімай справе, у маёй дачцэ, спакоі і свабодзе...»

**Ягор ХРУСТАЛЕЎ**
**і яго таварышы («Карамболь»)**



## СТАРОНКІ СУСВЕТНАГА РОКА

### «АББА»

Ані-Фрыд Лінгстад, Ангета Фэльтског, Берн Ульвеўс і Бэнні Андэрсан упершыню сабраліся разам у 1971 годзе. 1973 годзе група стала называцца «АББА», па першых літарах імён яе ўдзельнікаў. Тады ж да іх прыйшоў першы поспех: песня «Ватэрлоа» заняла першае месца ў конкурсе Еўрабачання. А з 1974 года вядомасць ансамбля стала сусветнай. У канцы сямідзесятых яна пачала падаць, і ў 1983 годзе «АББА» распалася. Кожны з музыкантаў пачаў выступаць сольна. Аднак за параўнаўча невялікі тэрмін група займела фенаменальны поспех. Кружэлкі з іх песнямі прадаюцца дагэтуль, колькасць дасягнула 270 мільёнаў.

### ПОЛА АБДУЛ

Пола Абдул з дзяцінства займалася танцамі, потым стала прафесійнай танцоўшчыцай і звярнула на сябе ўвагу, выступаючы ў шоў пад час баскетбольных гульняў. Яна адкрыла ўласную школу танцаў, дзе навучала сваім «фірмовым па» такіх зорак, як Майкл Джэксан і Арнольд Швайэнегер. У канцы васьмідзесятых Пола выпусціла некалькі сінглаў і відэакліпаў, і яе песні адразу ж сталі шлягерамі.

### «ЭКСЕПТ»

Заходнегерманская група «Эксепт» утварылася ў 1977 годзе. У яе склад уваходзілі Уда Дыркшнайдэр — вакал, Йорг Фішар — гітара, Вольф Хофман — гітара, Петэр Болціс — бас, Стэфан Каўфман — ударныя. Іх першая кружэлка не мела вялікага поспеху. Аднак пасля выхаду ў 1980 годзе альбома «Я — бунтар» яны сталі вядомымі ў Еўропе. Кожны дыск набліжаў гучанне групы да «металічнага». Альбом 1985 года «Металічнае сэрца» менавіта ў такім стылі. Першая кампазіцыя альбома ўяўляла сабой інтэрпрэтацыю вядомага твора Бетховена «Да Элізы». Пасля гэтага «Эксепт» стаў адным з лідэраў «хард»энд«хэві». У 1987 годзе вакаліст Уда Дыркшнайдэр вырашыў, карыстаючыся папулярнасцю, арганізаваць уласную групу. Для «Эксепт» яго крок быў ракавым. Група адышла на другі план.

### «А-ХА»

Маладыя нарвежцы Мортан Харкет, Пол Воктар і Магнэ Фурохольмен упершыню сабраліся ў 1982 годзе і з самага пачатку вырашылі спяваць па-англійску. Папулярнасць прыйшла ў 1985 годзе. Першы ж альбом «А-ХА» стаў «залатым».

### «АЛФАВІЛЬ»

Гэта электроннае трыа з'явілася ў 1982 годзе ў ФРГ. Склад: Марыян Голд — вакал, Бергард Лойд — сінтэзатары, Фрэнк Мертэнс — сінтэзатары. На працягу двух год музыканты працавалі ў студыі грамзапісу. Першы ж сінгал прынёс ім вядомасць, а альбом «Вечна юны» вывеў калектыў у лік лепшых элетронных груп. Некаторыя песні сталі інтэрнацыянальнымі хітамі. Наступныя дыскі былі слабейшымі, але папулярнасць вялікая і дагэтуль.

### «ЭНІМАЛЗ»

Адна з найбольш яркіх англійскіх групп пачатку 60-х гадоў. Першы запіс, зроблены ў 1962 годзе: Эрык Бердан — вакал, Алан Прайс — арган, Хілтан Валянцін — гітара, Чэс Чэндлер — бас, Джон Сціл — ударныя, — разышоўся сярод прыхільнікаў тыражом усяго 500 экземпляраў. Але адна з копій трапіла ў рукі прадзёсера Мікі Моста, які зацікавіўся ёй усур'ёз. Вядомасць «Энімалз» прынесла апрацоўка народнай песні «Дом узыходзячага сонца», выкананая ў 1964 годзе. Аднак шматлікія гастролі прывялі да таго, што групу пакінуў Алан Прайс, які не пераносіў паветраных пералётаў. Лідэрам стаў Эрык Бердан, але яго схільнасць да алкагалю і наркотыкаў давяла групу да развалу — як раз у зеніце славы.

### «ЭЙШЭ»

Англійская супергрупа з'явілася ў 1981 годзе. **Прыстаўка «супер» не раптоўная: Эйшэ» стварылі сапраўды вялікія музыканты. Джон Уэтан — басіст і спявак, раней выступаў у такіх групах, як «Фэрмілі», «Кінг Крымзан», «Роксі Мюзік», «Юрай Хіп»; Сціў Хоу — гітарыст вялікай групы «Йес»; Джэф Даўнс — арганіст, выступаў у «Бэнглз», «Йес»; Карл Палмер — ударнік. Такое сузор'е збіраецца нячаста. Іх першая кружэлка запісана ў пачатку 1982 года пад назвай «Азія». Музыка была меладычнай і лёгкай для ўспрыняцця. Дыск імгненна стаў «плацінавым», дзевяць тыдняў пратрымаўся на першым месцы. Наступныя кружэлкі былі куды слабейшымі. Пасля 1985 года група маўчала пяць год — наступны альбом выйшаў у 1990 годзе. Восенню таго ж года «Эйшэ» выступала ў СССР.**

**Падрыхтаваў А. ЮРЫН.**

НАДОЕЧЫ

## МАЙСТАР



Прыезд і выступленне ў Мінску такіх «зорак» сусветнай музыкі, як Іегудзі МЕНУХІН і сімфанічны аркестр «Філармонія Хунгарыкі» — падзея неардынарная.

Жадаючых пачуць Гайдна і Бетховена ў іх выкананні было значна больш, чым магла ўмясціць зала Дзяржаўнай філармоніі. Тыя, каму пашанцавала ўсё ж пабываць на канцэрце, прысутнічалі на сапраўдным свяце вялікага мастацтва і атрымалі вялікую асалоду. Астатнім дапамагло ў гэтым тэлебачанне. А нам пашчасціла займець здымак для «Аўдыторыі № 7».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МКПА імя Я. Коласа.

4 сакавіка
Зак. 1698.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.